ПАСТАНОВА МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
20 мая 2026 г. № 104

# Аб змяненні пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 23 красавіка 2025 г. № 75

На падставе часткі шостай пункта 3 артыкула 163 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Унесці ў пастанову Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 23 красавіка 2025 г. № 75 «Аб тыпавых вучэбных планах агульнай сярэдняй адукацыі» наступныя змяненні:

1.1. падрадковую заўвагу да тыпавога вучэбнага плана сярэдняй школы, зацверджанага гэтай пастановай, дапоўніць пунктам 8 наступнага зместу:

«8. У выпадку прыняцця рашэння аб арганізацыі вучэбных заняткаў на даму і ва ўстанове адукацыі навучэнцы наведваюць вучэбныя заняткі ва ўстанове адукацыі, якой арганізавана такое навучанне і выхаванне, у тым ліку і вучэбныя заняткі па вучэбных прадметах (модулях), якія не ўключаны ў гэты тыпавы вучэбны план для арганізацыі навучальнага працэсу на даму, у колькасці вучэбных гадзін, прадугледжаных тыпавым вучэбным планам пачатковай школы, базавай школы, школы-інтэрната для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, гімназіі, ліцэя.»;

1.2. тыпавы вучэбны план спецыялізаванага ліцэя, зацверджаны гэтай пастановай, выкласці ў новай рэдакцыі (дадаецца);

1.3. тыпавы вучэбны план суворaўскага ваеннага вучылішча, зацверджаны гэтай пастановай, выкласці ў новай рэдакцыі (дадаецца).

2. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу з 1 верасня 2026 г.

**Міністр** **А.І.Іванец**

УЗГОДНЕНА

Міністэрства абароны
Рэспублікі Беларусь

Міністэрства ўнутраных спраў
Рэспублікі Беларусь

Міністэрства па надзвычайных
сітуацыях Рэспублікі Беларусь

Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь

Міністэрства спорту
Рэспублікі Беларусь

Дзяржаўны камітэт судовых
экспертыз Рэспублікі Беларусь

Следчы камітэт
Рэспублікі Беларусь

Дзяржаўны пагранічны камітэт
Рэспублікі Беларусь

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
23.04.2025 № 75
(у рэдакцыі пастановы
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
20.05.2026 № 104)

**ТЫПАВЫ ВУЧЭБНЫ ПЛАН**
**спецыялізаванага ліцэя**

| I. Дзяржаўны кампанент | Колькасць вучэбных гадзін на тыдзень па класах | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | VII | VIII | IX | X | XI |
| 1. Беларуская мова | 2 | 2 | 2 | 1/2[2] (2)[1] | 2/1[2] (2)[1] |
| 2. Беларуская літаратура | 1/2[2] | 2/1[2] | 1/2[2] | 2/1[2] | 1/2[2] |
| 3. Руская мова | 2 | 2 | 2 | 2/1[2] (2)[1] | 1/2[2] (2)[1] |
| 4. Руская літаратура | 2/1[2] | 1/2[2] | 2/1[2] | 1/2[2] | 2/1[2] |
| 5. Замежная мова | 3 | 3 | 3 | 3 (2)[1] | 3 (2)[1] |
| 6. Матэматыка | 5 (4)[1] | 5 (4)[1] | 5 (4)[1] | 5 (4)[1] | 5 (4)[1] |
| 7. Інфарматыка | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 |
| 8. Сусветная гісторыя | 1 | 1 | 1/2[2] | – | – |
| 9. Гісторыя Беларусі | 1 | 1 | 1(2/1[2])[1] | – | – |
| 10. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі | – | – | – | 2 (3)[1] | 2 (3)[1] |
| 11. Грамадазнаўства | – | – (1)[1] | 1 (2)[1] | 1 (3)[1] | 1 (3)[1] |
| 12. Геаграфія | 1 | 2 | 2/1[2] | 1 | 1 |
| 13. Біялогія | 2 | 2 | 1/2[2] (2)[1] | 2 | 2 |
| 14. Фізіка | 2 | 2 | 3/2[2] (2)[1] | 4 (2)[1] | 4 (2)[1] |
| 15. Астраномія | – | – | – | – | 1 |
| 16. Хімія | 1 | 2 | 2 (1/2[2])[1] | 2 | 2 |
| 17. Працоўнае навучанне | 1 | 1 | – | – | – |
| 18. Фізічная культура і здароўе | 3<br>2[3] | 3<br>2[3] | 3<br>2[3] | 3<br>2[3] | 3<br>2[3] |
| 19. Дапрызыўная і медыцынская падрыхтоўка | – (1)[1] | 1 | 1 | 1 | 1 |
| 20. Чарчэнне | – | – | – | 1 | – |
| Абавязковы аб’ём вучэбнай нагрузкі ў тыдзень на аднаго вучня | 28<br>27[3] | 31<br>30[3] | 31<br>30[3] | 32<br>31[3] | 32<br>31[3] |
| II. Кампанент установы адукацыі | 8 | 6 | 8 | 8 | 8 |
| Максімальна дапушчальны аб’ём вучэбнай нагрузкі ў тыдзень на аднаго вучня | 31 | 32 | 34 | 35 | 35 |
| Агульная колькасць вучэбных гадзін, якая фінансуецца з бюджэту | 36 | 37 | 39 | 40 | 40 |
| Вучэбна-палявыя зборы:<br>у днях<br>у гадзінах | – | 5<br>30 | – | 10<br>60 | – |

[1] У дужках вызначана колькасць вучэбных гадзін на тыдзень, якая адводзіцца на вывучэнне вучэбных прадметаў у спецыялізаваным ліцэі Міністэрства ўнутраных спраў.

[2] Першая лічба вызначае колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне вучэбнага прадмета ў першым паўгоддзі, другая – у другім паўгоддзі.

[3] Для вучняў спецыяльнай медыцынскай групы: колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне вучэбнага прадмета «Фізічная культура і здароўе»; абавязковы аб’ём вучэбнай нагрузкі ў тыдзень на аднаго вучня.

Заўвагі:

1. Па вучэбным прадмеце «Фізічная культура і здароўе» дзяленне на групу хлопчыкаў (юнакоў) і групу дзяўчынак (дзяўчат) у X–XI класах ажыццяўляецца ў межах 2 вучэбных гадзін.

2. У X–XI класах можа быць рэалізавана адукацыйная праграма падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын у памеры 6 гадзін у тыдзень за кошт гадзін кампанента ўстановы адукацыі.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
23.04.2025 № 75
(у рэдакцыі пастановы
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
20.05.2026 № 104)

**ТЫПАВЫ ВУЧЭБНЫ ПЛАН**
**сувораўскага ваеннага вучылішча**

| I. Дзяржаўны кампанент | Колькасць вучэбных гадзін на тыдзень па класах | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | VII | VIII | IX | X | XI |
| 1. Беларуская мова | 2 | 2 | 2 | 1/2[1] | 2/1[1] |
| 2. Беларуская літаратура | 1/2[1] | 2/1[1] | 1/2[1] | 2/1[1] | 1/2[1] |
| 3. Руская мова | 2 | 2 | 2 | 2/1[1] | 1/2[1] |
| 4. Руская літаратура | 2/1[1] | 1/2[1] | 2/1[1] | 1/2[1] | 2/1[1] |
| 5. Замежная мова | 3 | 3 | 3 | 2 | 2 |
| 6. Матэматыка | 5 | 5 | 5/4[1] | 5–6[2] | 5–6[2] |
| 7. Інфарматыка | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 |
| 8. Сусветная гісторыя | 1 | 1 | 1/2[1] | – | – |
| 9. Гісторыя Беларусі | 1 | 1 | 1 | – | – |
| 10. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі | – | – | – | 2 | 2 |
| 11. Грамадазнаўства | – | – | 1 | 1 | 1 |
| 12. Геаграфія | 1 | 2 | 2/1[1] | 1 | 1 |
| 13. Біялогія | 2 | 2 | 1/2[1] | 2 | 2 |
| 14. Фізіка | 2 | 2 | 3/2[1] | 2–4[2] | 2–4[2] |
| 15. Астраномія | – | – | – | – | 1 |
| 16. Хімія | 1 | 2 | 2 | 2 | 2 |
| 17. Фізічная культура і здароўе | 3 | 3 | 3 | 3 | 3 |
| 18. Дапрызыўная і медыцынская падрыхтоўка | – | 1 | 1 | 1 | 1 |
| 19. Чарчэнне | – | – | – | 1 | – |
| Абавязковы аб’ём вучэбнай нагрузкі ў тыдзень на аднаго вучня | 27 | 30 | 31/30[1] | 29–32[2] | 29–32[2] |
| II. Кампанент установы адукацыі | 9 | 7 | 8/9[1] | 11/8[1] | 11/8[1] |
| Максімальна дапушчальны аб’ём вучэбнай нагрузкі ў тыдзень на аднаго вучня | 32 | 33 | 34 | 35 | 35 |
| Агульная колькасць вучэбных гадзін, якая фінансуецца з бюджэту | 36 | 37 | 39 | 40 | 40 |
| Вучэбна-палявыя зборы:<br>у днях<br>у гадзінах | –<br><br> | <br>5<br>30 | –<br><br> | <br>10<br>60 | –<br><br> |

[1] Першая лічба вызначае колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне вучэбнага прадмета ў першым паўгоддзі, другая – у другім паўгоддзі.

[2] Першая лічба ў ланцужку вызначае колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне вучэбнага прадмета на базавым узроўні, а таксама абавязковы аб’ём вучэбнай нагрузкі ў тыдзень на аднаго вучня, колькасць вучэбных гадзін кампанента ўстановы адукацыі пры вывучэнні ўсіх вучэбных прадметаў на базавым узроўні, другая – пры вывучэнні асобных вучэбных прадметаў на павышаным узроўні.

Заўвага. У X–XI класах можа быць рэалізавана адукацыйная праграма падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын у памеры 6 гадзін у тыдзень за кошт гадзін кампанента ўстановы адукацыі.